ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

# АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ ЛАКОТКА
## (Да 65-годдзя з дня нараджэння)



Імя акадэміка Аляксандра Іванавіча Лакоткі добра вядома ў Беларусі і за яе межамі. Ён нарадзіўся ў 1955 годзе ў вёсцы Кузьмічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1977 годзе скончыў архітэктурны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута, працаваў архітэктарам інстытута БелНДІ гіпрасельбуд, загадчыкам аддзела, намеснікам дырэктара Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту, кіраўніком майстэрні і галоўным архітэктарам праектаў Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута. З 1995 года яго працоўная біяграфія непарыўна звязана з Акадэміяй навук Беларусі. А. І. Лакотка займаў пасады загадчыка аддзела архітэктуры, намесніка дырэктара па навуковай рабоце, дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі. З 2012 года ён узначальвае Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

А. І. Лакотка – акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар. Выдатны вучоны ў галіне архітэктуры, мастацтвазнаўства, этналогіі, гісторыі ён унёс важкі ўклад у распрацоўку метадаў даследавання і атрыбуцыі помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва, выяўлення агульных і рэгіянальных рыс народнай архітэктуры і побыту, айчыннай скансеналогіі. Яго даследаванні накіраваны на вырашэнне актуальных праблем развіцця нацыянальных традыцый, ахову і рэстаўрацыю гісторыка-архітэктурнай спадчыны і развіццё на яе аснове турызму. Аляксандр Іванавіч быў адным з аўтараў стварэння Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Ім выкананы шэраг праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, распрацавана сістэма комплекснай ацэнкі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны для стварэння турысцка-рэкрэацыйных зон.

Аляксандр Іванавіч раскрыў заканамернасці эвалюцыі беларускай архітэктуры ў сусветным кантэксце, агульныя і рэгіянальныя асаблівасці народнага дойлідства Беларусі. Значным навуковым дасягненнем А. І. Лакоткі стала сфарміраваная і навукова абгрунтаваная сістэма нацыянальных рыс беларускай архітэктуры, што знайшло ўкараненне ў архітэктурна-будаўнічай практыцы. У час яго шматлікіх экспедыцый і архіўных вышукаў абследаваны і атрыбутаваны шматлікія помнікі архітэктуры і народнага дойлідства. У выніку даследаванняў народнага дойлідства Беларусі ім раскрыты асаблівасці гістарычнага працэсу фарміравання традыцыйнага асяроддзя бытавання, што стала падмуркам для стварэння Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

А. І. Лакотка – аўтар больш за 300 навуковых работ, у тым ліку 25 кніг і манаграфій, навуковы рэдактар і член аўтарскага калектыву шматтомных выданняў: «Архітэктура Беларусі» (6 кніг), «Гарады і вёскі Беларусі» (выдадзена 11 кніг), «Нарысы культуры Беларусі», «Беларусы», «Турысцкая мазаіка Беларусі», перыядычнага зборніка «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі». Пад яго кіраўніцтвам здзейснены шэраг міжнародных праектаў па даследаванні культурных сувязей беларускага, рускага, украінскага, літоўскага памежжа.

Аляксандр Іванавіч вядзе вялікую навукова-арганізацыйную работу. Ён з'яўляецца навуковым кіраўніком падпраграмы «Гісторыя і культура», удзельнікам дзяржаўных праграм «Адраджэнне сяла», «Ахова і развіццё Прыпяцкага Палесся», «Развіццё Нацыянальнага парка Нарачанскі», рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Навуковая актыўнасць А. І. Лакоткі арганічна звязана з яго грамадскай дзейнасцю. Аляксандр Іванавіч з'яўляецца членам Еўрапейскага савета па культуры, Міжнароднай арганізацыі народнай

творчасці ЮНЕСКА, членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі архітэктуры, членам Союза архітэктараў Беларусі, акадэмікам Міжнароднай славянскай акадэміі па пытаннях культуры, адукацыі і навукі. Пад яго кіраўніцтвам пад эгідай ЮНЕСКА арганізаваны трэнінг па імплементацыі Міжнароднай канвенцыі па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. А. І. Лакотка з'яўляецца членам рэдкалегіі навуковых часопісаў Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы.

А. І. Лакотка прымае актыўны ўдзел у рабоце Бюро Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, Савета па экспертызе Дзяржаўных праграм пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, навукова-метадычнага Савета па ахове і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Аляксандр Іванавіч – не толькі выдатны вучоны, здольны да ўспрымання ўсё новых і новых пластоў у развіцці архітэктуры і мастацтвазнаўства, але і выдатны кіраўнік і арганізатар навукі. Пад яго кіраўніцтвам Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры стаў сапраўдным цэнтрам гуманітарных даследаванняў у нашай краіне. А. І. Лакотка шмат робіць для падрыхтоўкі навуковай змены ў галіне этналогіі і мастацтвазнаўства. Ён мае асабістую навуковую школу. Падрыхтаваў 8 дактароў і 7 кандыдатаў навук, з'яўляецца членам Прэзідыума ВАК Беларусі.

А. І. Лакотка яшчэ і таленавіты мастак, які занатоўвае свае ўражанні падчас шматлікіх вандровак па Беларусі. Ён выдатны майстар малюнка, акварэльнага архітэктурнага пейзажа. Пяшчотай і любоўю да роднай зямлі, да ціхіх вясковых краявідаў прасякнуты яго пейзажныя серыі. Вынікам сталі навукова-паэтычныя эсэ з аўтарскімі ілюстрацыямі: «Цвета и легенды родных просторов», «Простор родной. Беларусь».

Праца Аляксандра Іванавіча Лакоткі высока адзначана – ён з'яўляецца лаўрэатам Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», Прэмій Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама ўзнагародамі іншых міністэрстваў і ўстаноў.

*В. І. Жук, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, дырэктар філіяла "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы" Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*